МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

24 мая 2017 г. №18 (402)

СТРАТЭГІІ І ПРАКТЫКА

Сустрэча без пасрэднікаў

Як не застацца на эканамічнай «узбочыне»?

Стварэнне пляцовак для дыялогу і дыскусій паміж уладай, бізнесам і грамадствам стане важным стратэгічным крокам для паляпшэння эканамічнай сітуацыі, такім чынам можна будзе пачуць прапановы ўсіх бакоў. Гэтая думка чарговы раз прагучала падчас эканамічнай канферэнцыі «Практыка рэалізацыі эканамічнай стратэгіі Беларусі. Інвестыцыі для бізнесу і рэгіёнаў».

На чацвёртай па ліку сустрэчы разам сабраліся прадстаўнікі Міністэрства эканомікі, дэпутацкага корпуса Рэспублікі Беларусь, фінансавых, навуковых, аналітычных і даследчых устаноў, а таксама кіраўнікі бізнес-суполак і прадстаўнікі дзелавых колаў не толькі з нашай краіны, але і з ЗША. Такім чынам, канферэнцыя праходзіла ў фармаце дыскусійнага круглага стала, калі ўлада і прадпрымальнікі гаварылі адно з адным без пасрэднікаў.

— Мы працуем у вельмі цікавы час, і тэма, якую закранае гэтая канферэнцыя, вялікая і шматаспектная, — абвясціў на адкрыцці мерапрыемства **старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў Уладзімір КАРАГІН.** — На аснове мінулых канферэнцый мы прымалі рэзалюцыю і, зыходзячы з яе тэзісаў, рабілі прапановы ўладзе па шэрагу мерапрыемстваў.

У сваіх выступленнях удзельнікі закраналі важныя праблемы, якія стрымліваюць беларускіх прадпрымальнікаў. Згадваліся напружанасць на рынку працы, абставіны, што замаруджваюць укараненне сучасных тэхналогій, фінансавая няўстойлівасць значнай часткі камерцыйных арганізацый і іншае. У той жа час называліся і спосабы ўплыву на сітуацыю, якая склалася сёння. Напрыклад, паляпшэнне ўмоў для развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы, павелічэнне эканамічнай свабоды і прыватнага сектара, стварэнне інстытутаў сучаснай свабоднай рынкавай эканомікі. Усё гэта можа прынесці вынік, калі стане абавязковым элементам доўгатэрміновай стратэгіі развіцця і росту.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ. *yurgel@zviazda.by*

ТЭМА ТЫДНЯ

ГРОШЫ ВЫБІРАЮЦЬ КЛІМАТ

Як палепшыць дзелавыя і інвестыцыйныя ўмовы ў краіне

Фота Надзеі БУЖАН.

Аляксандр Бабарэка — дырэктар фірмы, якая вырабляе засцерагальную галаграфічную прадукцыю. Для спажыўца гэта рэч звычайная і натуральная. Напрыклад, тыя бліскучыя выявы, што можна пабачыць на акцызных марках. Хоць такога кшталту прадукцыя выкарыстоўваецца для абароны розных дакументаў: кантрольных знакаў, агульнаграмадзянскага пашпарта, векселяў, каштоўных папер, накладных.

Фірма пастаўляе сваю прадукцыю не толькі на беларускі рынак, але і за мяжу: у Літву, Непал, Азербайджан, Кыргызстан, Руанду, Грэцыю, Сербію... Да таго ж зараз кампанія адшукала новую нішу — іміджавыя галаграмы, якія прыцягваюць увагу спажыўца. Для бліжняга замежжа і краін СНД гэта ўнікальны тавар, бо мала хто валодае такога кшталту тэхналогіямі.

А ўсё пачыналася 19 гадоў таму як прыватнае беларуска-швейцарскае прадпрыемства. Прыцягнуць швейцарскія інвестыцыі атрымалася ў акадэміка Міжнароднай інжынернай акадэміі Леаніда Таніна, пасля чаго і была арганізавана вытворчасць. І хоць з цягам часу кампанія стала выключна беларускай, свой старт яна брала менавіта з дапамогай замежнага інвестара, які «ўклаўся» ў ідэю беларускага навукоўца.

стар. 4

АКТУАЛЬНЫ ДЫЯЛОГ

УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ДАВЕРУ

На Віцебшчыне самая вялікая колькасць населеных пунктаў — больш за 6,2 тысячы. І ў кожным, незалежна ад колькасці насельніцтва, мясцовая ўлада абавязана стварыць годныя ўмовы для пражывання. Зразумела, гэта патрабуе ад дэпутатаў вялікай адказнасці. Трэба вырашаць нямала задач, здымаць праблемныя пытанні. Нярэдка па вопыт у вобласць прыязджаюць з іншых рэгіёнаў.
Пра актуальныя праблемы, дасягненні і планы наш карэспандэнт пагутарыў са старшынёй Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімірам ЦЯРЭНЦЬЕВЫМ.

— Уладзімір Уладзіміравіч, падчас абрання на пасаду вы падкрэслілі, што асаблівая ўвага павінна ўдзяляцца развіццю глыбінкі. Гэта зрабіць, напэўна, цяжка, калі большасць раёнаў атрымліваюць датацыі?

— Так. Для рашэння сацыяльна значных пытанняў, узмацнення даходнай часткі мясцовых бюджэтаў трэба павялічыць уласныя даходы рэгіёнаў.

Тут ёсць некалькі спосабаў. Напрыклад, смялей трэба перадаваць у распараджэнне рэгіёнаў прадпрыемствы рэспубліканскай формы ўласнасці. У тым ліку і гарадаўтваральныя. У выніку будзем больш актыўна імі займацца, не азіраючыся на міністэрствы. У мясцовы бюджэт трапіць значная сума падатку на прыбытак. Гэта датычыцца і перадачы маёмасці, якая не выкарыстоўваецца ў сельскай мясцовасці, малому і сярэдняму бізнесу.

На жаль, нямала гаспадарак апынуліся ў няпростай сітуацыі. Таму ствараюцца інтэграцыйныя структуры. У іх складзе тэхналагічна яднаюцца вытворцы прадукцыі, мясакамбінаты, малаказаводы, камбінаты хлебапрадуктаў. Плюс — гандлёвыя прадпрыемствы. Гэта рэальная схема для павелічэння аб'ёмаў вытворчасці, паніжэння выдаткаў.

— Віцебшчына — лідар у краіне па колькасці населеных пунктаў. Нямала і такіх вёсак, дзе жывуць да 10 чалавек. Як органы ўлады клапоцяцца пра жыхароў такіх вёсак?

— Прыкладна трэць з больш чым 6 тысяч вёсак — маланаселеныя і аддаленыя. У прыблізна 2 тысячах пражывае 10 чалавек і меней, а ў 75% колькасць жыхароў не перавышае 50 чалавек.

Лічу, што і невялічкія вёскі не адарваныя ад цывілізацыі. Для паляпшэння транспартнага абслугоўвання пастаянна

абнаўляецца аўтобусны парк. Усе вёскі ахоплены гандлёвым і бытавым абслугоўваннем. Туды, у прыватнасці, прыязджаюць аўталаўкі... Дарэчы, тавары прывозяць і камерцыйныя «крамы на колах». Функцыянуе каля 150 комплексных прыёмных пунктаў.

стар. 3